## Раздзел 1
# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА І СУЧАСНАЕ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ ВАЛОЖЫНСКАГА КРАЮ

УДК 94(476.1)Тышкевічы

**Н. У. Бобрык,**
*навуковы супрацоўнік*
*ДУ «Валожынскі краязнаўчы музей», Валожын*

## ЗНАЁМЫЯ І НЕЗНАЁМЫЯ ТЫШКЕВІЧЫ

Для многіх беларусаў род Тышкевічаў малавядомы. Мы больш знаёмы з прадстаўнікамі роду Радзівілаў, Сапегаў, Агінскіх. Дык хто ж яны, Тышкевічы? Як жылі, чым займаліся, чым знакамітыя? Як гісторыя нашых мясцін звязана з лёсам гэтых людзей? Давайце пагартаем старонкі летапісу магнацкага роду Тышкевічаў, пройдзем па іх жыццёвых сцежках, адчуем атмасферу тых часоў і падзей!

**Ключавыя словы:** магнацкі род, Тышкевічы, Валожын, валожынская лінія Тышкевічаў.

**N. U. Bobryk,**
*Research specialist of the State Institution*
*“Valozhynski Museum of Local Lore”, Valozhyn*

## THE KNOWN AND UNKNOWN HOUSE OF TYSZKIEWICZ

Many Belarusians have little knowledge of the Tyszkiewicz family. We are more familiar with the representatives of the Houses of Radziwiłł, Sapieha, Ogiński. So, who are they, the Tyszkiewicz family? How did they live? What did they do? What are they



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

famous for? How is the history of our Valozhyn region connected with the fate of these people? Let's turn the pages of the chronicle of the Tyszkiewicz magnate family, walk along their life paths, feel the atmosphere of those times and events!

**Key words:** magnate family, the Tyszkiewicz family, Valozhyn, Valozhyn line of the Tyszkiewicz family.

Тышкевічы – старажытны шляхецкі род герба «Ляліва». У першай палове XV ст. жыў Каленік Мышкавіч, якому князь Вялікага Княства Літоўскага Свідрыгайла ў 1437 г. падараваў сёлы і слабоды ва Украіне – у Жытомірскім і Оўруцкім паветах, а таксама маёнтак Чарталесы, на месцы якога пазней быў пабудаваны горад Бярдзічаў.

Ад аднаго з сыноў, якога звалі Тышка, паходзіць прозвішча роду Тышкевічаў. З цягам часу маёнткі прадстаўнікоў гэтага роду з'явіліся на землях беларускіх і літоўскіх: Лагойск, Астрашыцкі Гарадок, Валожын, Гарадок (паблізу Маладзечна), Свіслач, Паланга, Біржай.

У 1517 г. Васіль Тышкевіч, сын Тышкі, ажаніўся на Аляксандры Чартарыйскай і атрымаў Лагойск у якасці пасагу. Ён стаў заснавальнікам малодшай графскай лініі роду Тышкевічаў. З цягам часу гэта лінія была падзелена на дзве: беларускую і ўкраінскую. Назва вызначалася ад месца знаходжання ўладанняў.

Старэйшы сын Васіля Тышкевіча – Юрый – з 1550 г. атрымаў званне каралеўскага двараніна. Марцін Тышкевіч, другі сын Юрыя, быў войтам мінскім, маршалкам Слонімскага павета. Яго сын Юзаф і ўнук Мікалай вялікіх пасад не займалі.

А вось Эмануэль Уладзіслаў, сын Мікалая, быў павятовым падстоліем брэсцкім, а яго старэйшы брат Міхаіл Ян быў віцебскім ваяводам.

Ад Тэадора, сына Эмануэля, паходзіць украінская лінія Тышкевічаў, да якой адносіцца вядомая польская актрыса Беата Тышкевіч, якая нарадзілася 14.08.1938 г. у Варшаве.

Чацвёрты сын Эмануэля – Міхаіл Ян «з Лагойска», даў пачатак беларускай лініі графскага роду, якая аддзялілася ад украінскай.

У Міхаіла Яна было чатыры сыны: Феліцыян, Міхаіл Ян, Антоній Казімір і першы ўладальнік Валожына – Юзаф. Усе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яны былі вядомымі людзьмі ВКЛ, займалі высокія ваенныя пасады ў войску літоўскім.

Старэйшы сын Феліцыян (1719–1792) – генерал-маёр войска ВКЛ і стараста стшалкоўскі, меў двух сыноў Даменіка і Пія. Яго знакамітыя сыны Канстанцін і Яўстафій – вядомыя грамадскія дзеячы, гісторыкі, краязнаўцы, археолагі, заснавальнікі айчыннай навуковай археалогіі, фалькларыстыкі, этнаграфіі і музеязнаўства. Даследаванні гэтых вядомых дзеячаў і сёння ўяўляюць сабою вялікую каштоўнасць у розных сферах навукі і культуры нашай краіны. Іх дзейнасць заслугоўвае высокай адзнакі і падзякі ад сучаснікаў.

Малодшым сынам Міхаіла Яна быў Юзаф Ігнацый Тышкевіч – палкоўнік у войску ВКЛ і стараста веляцінскі. Ён набыў маёнтак Валожын за 100 тысяч залатых у Адама Чартарыйскага ў даволі пажылым узросце. На гэты час Юзафу Міхайлавічу было 79 гадоў. 12 гадоў ён валодаў мястэчкам Валожын.

Мы, валожынцы, удзячны яму за мураваны касцёл, які ўжо больш двух стагоддзяў велічна ўзвышаецца на плошчы нашага горада, за прыгожыя палацы. Калі б сцены гэтых архітэктурных помнікаў маглі гаварыць, то гістарычны летапіс нашага горада папоўніўся бы многімі цікавымі звесткамі. У скляпенні касцёла пахаваны шэсць прадстаўнікоў роду Тышкевічаў. Першым тут знайшоў упакаенне сам Юзаф Ігнацый, які паўгода не дажыў да завяршэння будаўніцтва храма. Сапраўдным упрыгожаннем касцёла было ўмураванае ў сцяну надмагілле фундатара: анёл трымае мармуровае табло, у верхняй частцы якога спіць у даспехах чалавек, а ў ніжняй надпіс: «Дом Ясна Вяльможнага Юзафа Ігната Графа на Лагойску і Бярдзічаве, пераемніка на Біржах, Дубінах, Валожыне… Тышкевіча, Старасты Веляцінскага, Палкоўніка Нацыянальнай Кавалерыі, Кавалера Ордэна Белага Арла і Святога Станіслава, Сіндзіка Апостальнага Высокапачытаемых ксяндзоў Бернардзінаў Мінскага Канвента».

У Юзафа Ігната было чацвёра дзяцей: сын Міхаіл і тры дачкі: Клацільда, Юзэфа і Ядвіга.

Міхаіл Тышкевіч быў вельмі здольны, адказны, адукаваны, патрабавальны да сябе чалавек, вядомы ваенны дзеяч ВКЛ, палкоўнік, кавалер ордэна Воінскай доблесці. Сам Напалеон Банапарт прымаў яго ў члены ордэна Ганаровага легіёна, што



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з'яўляецца найвышэйшым знакам адрознення, пашаны і прызнання асаблівых заслуг у Францыі.

Граф прымаў удзел у рабоце сейма 1788–1792 гг. Ён не прыняў раздзел Рэчы Паспалітай і быў староннікам рашэння польскай эліты ў падтрымцы французскага імператара Напалеона ў вайне супраць Расіі. У ліпені 1812 г. Міхаіл Тышкевіч сабраў на свае сродкі 17-ы кавалерыйскі полк і ўзначаліў яго. Полк уваходзіў у склад перадавых часцей напалеонаўскай арміі. Чым былі выкліканы такія паводзіны графа? Адназначна адказаць на гэта пытанне цяжка.

Міхаіл быў першым графам з Тышкевічаў, які зацікавіўся літоўскім прымор'ем. 13 ліпеня 1824 г. ён набыў Палангу разам з пасёлкамі Грушлаўке і Дарбеняй і гаспадарыў там з 1824 г. па 1839 г. Як бачым, пры Міхаілу Тышкевічу былі значна пашыраны графскія ўладанні. Да яго перайшоў Біржанскі маярат Радзівілаў на тэрыторыі сучаснай Літвы. Так Міхаіл Тышкевіч стаў пачынальнікам біржанскай лініі роду Тышкевічаў. Міхаіл быў жанаты на баранесе Іаганне Карп. У яго было чацвёра дзяцей: Ян Канстанцін, Юзаф, Бенедыкт і дачка Іванна.

Старэйшы сын Міхаіла Ян Канстанцін валодаў Валожынам з 1839 г. па 1862 г. Сваёй сям'і ў яго не было. Гэта быў вельмі сціплы, добры чалавек. Ян Канстанцін на працягу ўсяго жыцця займаўся дабрачыннай дзейнасцю. Пры ім пачалося будаўніцтва царквы Раўнаапостальных Канстанціна і Алены ў Валожыне. Свае значныя сродкі граф ахвяраваў на будаўніцтва храма.

Ян Канстанцін быў калекцыянерам. У Біржанскім палацы ён сабраў унікальную калекцыю карцін і партрэтаў, адкрыў хатнюю капліцу, пакой-скарбніцу. Вакол палаца разбіў пейзажны парк, пабудаваў аранжарэю са сферычным купалам. Пасля трагічнай смерці Яна Тышкевіча большая частка яго ўладанняў была перададзена старэйшаму пляменніку Міхаілу, а Валожын перайшоў да другога пляменніка – Яна Вітольда Тышкевіча.

Другі сын Міхаіла Тышкевіча Юзаф нарадзіўся ў 1805 г. Быў кіраўніком дваран Ашмянскага ўезда. Да 1835 г. жыў у Валожыне. Пасля смерці бацькі валодаў Палангай.

Жонка Юзафа Тышкевіча Ганна Забела з'яўляецца прапрапрабабкай вядомай польскай актрысе Беаце Тышкевіч. Пасля смерці Юзафа ў 1844 г. усе яго ўладанні перайшлі сынам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Трэці сын Міхаіла – Бенедыкт, вядомы літоўскі арыстакрат, граф, уладальнік Чырвонага Двара, калекцыянер і мецэнат. Быў жанаты на Вандзе Ваньковіч, дачцэ ігуменскага павятовага маршалка Антона Ваньковіча. У іх нарадзіліся тры дачкі: Людгарда, Яна і Марыя – маці будучага знакамітага фатографа.

Бенедыкт сабраў унікальную калекцыю карцін, дзе былі творы Леанарда да Вінчы, Караваджа, Рубенса. У багатай асабістай бібліятэцы Бенедыкта былі хронікі з Нюрберга XV ст., хронікі еўрапейскіх ваенных паходаў, надрукаваных у XVII ст., працы Галілеа Галілея і другіх вядомых аўтараў. Сваё захапленне мастацтвам ён перадаў унуку, якога выхоўваў да 14-гадовага ўзросту, таму што хлопчык рана застаўся сіратою.

Ва ўрочышчы Вялае, у аддаленым адасобленым кутку Налібоцкай пушчы, дзе ў незлічонай колькасці вадзіліся ласі, казулі, мядзведзі, ваўкі, рысі, граф Бенедыкт Тышкевіч вырашыў пабудаваць паляўнічую рэзідэнцыю. З часам у доміка з’явіўся другі паверх, непадалёк размясціліся гаспадарчыя пабудовы – паляўнічы маёнтак разрастаўся. Кожны год пад восень Бенедыкт прыязджаў у Вялае са сваёй рэзідэнцыі, маёнтка Чырвоны Двор, што знаходзіўся на тэрыторыі сучаснай Літвы, на вялікай чатырохконнай брычцы – «берліне» – у суправаджэнні шматлікіх падвод з чэляддзю, кухняй, сабакарняй.

Бенедыкт Генрых Тышкевіч (1852–1935), унук першага гаспадара Вялага, быў заўзятым вандроўнікам і паляўнічым. Ён шмат падарожнічаў, можна сказаць, што аб’ездзіў увесь свет. У час сваіх вандровак граф шмат фатаграфаваў. На сусветнай выставе ў Філадэльфіі ў 1876 г. фотаработы майстра былі адзначаны залатым медалём. На гэты час было Бенедыкту толькі 24 гады.

Лёс склаўся такім чынам, што Бенедыкт рана аўдавеў. У яго на руках засталося трое малых дзяцей. Насталі цяжкія моманты дэпрэсіі. Урачы парадзілі яму памяняць месцажыхарства. Граф успамінае пра Вялае і пераязджае сюды. Гэта ён ператварыў цудоўны лясны куток у шыкоўную рэзідэнцыю, а замест драўлянага дома паставіў мураваны палац.

Бенедыкт Генрых – піянер беларускай мастацкай фатаграфіі. На другім паверсе палаца граф абсталяваў першую ў Беларусі фоталабараторыю і павільён, дзе фатаграфаваў сялян. Фотаработы графа былі вельмі дасканалымі, што гаворыць пра яго высокі прафесіяналізм. У некаторым родзе Бенедыкт быў фо-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тарэпарцёрам свайго часу. На многіх фатаграфіях адлюстроўваюцца прыгожыя налібоцкія краявіды.

Вялікую каштоўнасць маюць здымкі, на якіх ёсць бытавыя сцэны з жыцця мясцовых жыхароў, інтэр'еры графскіх памяшканняў, сялянскіх хат, партрэты сучаснікаў майстра. Па фотасюжэтах мы можам уявіць, як выглядалі беларусы таго часу, палюбавацца дзіўнай хронікай даўно мінулых дзён. Некаторыя фатаграфіі сведчаць пра тое, што граф валодаў добрым пачуццём гумару. Ён не баяўся быць смешным на сваіх здымках.

Бенедыкт вельмі любіў прыроду Налібоцкай пушчы. У 1902 г. побач з урочышчам Вялае ён адкрыў прыватны звярынец, плошча якога налічвала 400 га. Спачатку тут вадзіліся ласі і дзікі. Пасля граф прывёз двух бурых мядзведзяў, плямістых аленяў, казуль, лань з Аўстрыі. Бенедыкт ганарыўся звярынцам і заўсёды запрашаў сваіх гасцей наведаць яго. Доўгія часы Бенедыкт мог праводзіць сярод пушчанскай прыроды. Самыя цікавыя эпізоды ляснога жыцця, прыгожыя пейзажы пападалі ў аб'ектыў яго фотаапарата. Граф стварыў спецыяльную службу, якая сачыла за чысцінёй лесу, парадкам у звярынцы.

Падзеі Першай сусветнай вайны заставілі Бенедыкта пакінуць гэты прыгожы, маляўнічы куток і вярнуцца зноў у Францыю, дзе ён памёр у 1935 г. Шчаслівы выпадак дапамог адшукаць фатаграфіі Бенедыкта Тышкевіча супрацоўнікам французскага музея імя Нісефора Ньепса ў 1993 г. Вялікая даследчая работа прывяла супрацоўнікаў у Вялае, што на Валожыншчыне. Так мы даведаліся пра такія цікавыя старонкі біяграфіі Бенедыкта Тышкевіча, звязаныя з нашымі мясцінамі.

Пра далейшы лёс паляўнічага маёнтка маюцца розныя меркаванні. Ёсць звесткі, што ў 1903 г. граф Бенедыкт Генрык перадаў свае ўладанні старэйшаму сыну Джону – Яну. Мясцовыя жыхары помняць, што тут да 1939 г. бываў граф Ян Бенедыкт Тышкевіч. Калі гэтыя мясціны былі вызвалены ад палякаў, то чырвонаармейцы выкідвалі праз вокны ўсю графскую маёмасць. Дарослых жыхароў у палац не пускалі, а вось дзецям дазволілі туды зайсці. Бярнацкі Іван, які быў хрэснікам графа, вынес два фотаальбомы. Сам граф Тышкевіч быў арыштаваны чырвонаармейцамі і адпраўлены ў турму, што знаходзілася ў Валожыне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэтыя звесткі не супадаюць з нашымі данымі ў часе. І толькі фатаграфіі, якія захаваліся ў сям'і Івана Антонавіча Бярнацкага, змаглі праясніць сітуацыю. На многіх здымках прысутнічае вышэйупамянёны граф. Ён вельмі падобны да Бенедыкта Генрыка Тышкевіча. Але апошні памёр у 1935 г. ва ўзросце 83 гадоў. Значыць, на фатаграфіях другі чалавек, якога звалі Бенедыктам Янам Тышкевічам. Хутчэй за ўсё што гэта сын беларускага фатографа. У дзяцінстве яго звалі Джон, што значыць Ян, Іван. Значыць, Бенедыкт Ян Тышкевіч (1875–1948) – гэта і ёсць той апошні ўладальнік паляўнічага маёнтка ў Вялым. Да яго ў 1903 г. перайшлі бацькоўскія ўладанні ў Літве. Можна меркаваць, што з гэтага часу ён стаў гаспадаром Вялага. У польскі час Бенедыкт Ян бываў тут, займаўся паляваннем і фатаграфіяй. Пры такіх абставінах успаміны мясцовых жыхароў, звязаныя з асобаю графа Бенедыкта Тышкевіча, маюць падставу. Магчыма, гэта ён, а не яго бацька, перабудаваў палац у Вялым і адкрыў прыватны звярынец, пра які мы пісалі раней. На такія вывады нас навёў змест фільма Алеся Матафонава «Лабірынты. Гісторыя беларускага фотамастацтва». Два Бенедыкты, бацька і сын, члены адной графскай сям'і, якія вельмі любілі нашы налібоцкія мясціны і зрабілі іх вядомымі далёка за межамі Беларусі.

Цяпер у Вялым нас сустракаюць паўразбураныя сцены палаца, якія маўкліва прыпаднімаюць перад намі заслону часу і дапамагаюць уявіць тагачасныя карціны графскага жыцця.

Іванна, дачка Міхаіла Тышкевіча, стала жонкай Льва Паўлавіча Сапегі. Доўгі час жыла ў Варшаве. Памерла 24 красавіка 1873 г. у Фларэнцыі.

Значны ўклад у летапіс знакамітага роду ўнеслі ўнукі Міхаіла Тышкевіча: Міхаіл, Ян Вітольд, Юзаф – сыны графа Юзафа Тышкевіча.

Граф Міхаіл Юзаф быў адным з самых багатых магнатаў Расійскай імперыі. Да яго шматлікіх уладанняў была далучана значная частка нерухомасці дзядзькі Яна Канстанціна. Граф быў align рознабаковым чалавекам. Ён стаў першым польскім даследчыкам Старажытнага Егіпта. Спачатку наведаў гэту краіну як турыст. Але хутка яго вельмі захапілі археалагічныя раскопкі. Міхаіл Юзаф сустрэўся з віцэ-каралём Егіпта Махамедам Саід-пашу, які даў яму дазвол на правядзенне раскопак на ўсёй тэрыторыі краіны. Многія экспанаты і сёння маюць вельмі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вялікую каштоўнасць. У Еўропу граф прывёз 800 прадметаў старажытнага мастацтва, большая колькасць з якіх была перададзена ў Луўр. 250 экспанатаў Міхаіл Тышкевіч падарыў Віленскаму музею, некаторая частка была перададзена ў музей Лагойска, стваральнікамі якога былі яго сваякі Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы.

Юзаф Тышкевіч (1835–1891) сваё жыццё прысвяціў дзяржаўнай службе. Пайшоў у адстаўку ў чыне палкоўніка. Быў уласнікам многіх маёнткаў на тэрыторыі Літвы, якія перайшлі да яго ў спадчыну. Шмат зрабіў для развіцця сваіх рэзідэнцый. Пры Юзафе набыты параход, які рэгулярна курсіраваў па маршруце Паланга–Ліепая–Паланга. А Палангскі парк да гэтага часу адзін з самых лепшых узораў паркавай архітэктуры ў Літве. Вялікую частку капіталу граф укладваў у прамысловасць і гандаль. Меў вялікі даход ад экспарту лесу. У сям'і было 12 дзяцей. Памёр 26 мая 1891 г.

Ян Вітольд Тышкевіч (1831–1892) стаў уладальнікам Валожына пасля смерці дзядзькі – Яна Канстанціна – у 1862 г. Нарадзіўся ў Валожыне. Быў жанаты на Ізабэле Тышкевіч, меў пяцёра дзяцей: два сыны і тры дачкі. Рускі імператар пацвердзіў яму графскі тытул 8 мая 1861 г. Памёр у лютым 1892 г. у Валожыне.

Пасля яго смерці Валожын перайшоў да старэйшага сына Міхаіла. Міхаіл Іванавіч Тышкевіч быў заядлым паляўнічым і вельмі любіў коней. У Валожыне меліся канюшні, дзе ён разводзіў чыстакроўных арабскіх скакуноў і коней англійскай пароды. Графскія скакуны заваёўвалі ўзнагароды на выставах у Вільнюсе, Варшаве і Будапешце, былі пераможцамі на розных спаборніцтвах.

У супрацоўнікаў музея няма звестак пра сям'ю графа, яго нашчадкаў. Па недакладных звестках Міхаіл Тышкевіч нарадзіўся ў 1860 г. Год смерці 1938 г. Такая інфармацыя сустракаецца ў кнізе Іліяны Нарковіч «Тышкевичи из Вака». Зараз мы працуем над зборам матэрыялаў, якія бы дапоўнілі біяграфічныя звесткі апошняга ўладальніка Валожына.

Малодшы сын Яна Вітольда – Ян Юзаф Тышкевіч (1867–1903) меў чацвёра дзяцей: Соф'ю, Яна Міхаіла, Уладзіслава, Міхаіла Зыгмунда, які з'явіўся на свет пасля смерці бацькі. Ян Юзаф памёр ва ўзросце 35 гадоў у Швейцарыі, а праз два гады памерла і жонка. Уладанні графа перайшлі яго малалетнім дзецям.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Старэйшаму сыну Яну Міхаілу на гэты час было толькі сем гадоў. Калі ён пасталеў, усе клопаты пра сям'ю ляглі на яго плечы. У 1939 г. Ян Міхаіл Тышкевіч трагічна загінуў у авіякатастрофе ва ўзросце 43 гадоў. Нашчадкі гэтай веткі жывуць і зараз у Англіі і Канадзе.

Дадзенае даследаванне расказвае пра прадстаўнікоў валожынскай веткі Тышкевічаў, пачынаючы з Юзафа Міхайлавіча. Перыяд гісторыі Валожына з 1803 г. па 1939 г. звязаны з прадстаўнікамі гэтага вядомага графскага роду. Расказваючы пра наш горад, мы заўсёды ўспамінаем Тышкевічаў і паказваем турыстам спадчыну, якую яны нам пакінулі.


*1.* Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Валожынскага р-на. – Мінск : Мастац. літ., 1996. – 453 с.

*2. Гарбачэўскі, В.* Маё мястэчка – Валожын / В. Гарбачэўскі // Куфэрак Віленшчыны. – 2002. – № 1. – С. 80–115.

*3.* Фільм Алеся Матафонава «Лабірынты. Гісторыя беларускага фотамастацтва».



УДК 338.483.12(476.1)Тышкевичи



**Н. Е. Шелупенко,**
*кандидат культурологии, декан факультета культурологии и социально-культурной деятельности учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск*

**С. А. Пациенко,**
*кандидат культурологии, доцент кафедры менеджмента социально-культурной деятельности учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск*


## НАСЛЕДИЕ ТЫШКЕВИЧЕЙ КАК ФАКТОР РАЗВИТИЯ КУЛЬТУРНО-ПОЗНАВАТЕЛЬНОГО ТУРИЗМА В ВОЛОЖИНСКОМ РАЙОНЕ

В статье рассматриваются памятники архитектуры, составляющие историко-культурное наследие рода Тышкевичей на


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ